Источник: adu.by Национальный институт развития образования

**Демо-версия практического задания для экзамена по истории Беларуси, для учащихся 9-х классов (2022/2023 учебный год). Билет 6. Вариант 1**

**Білет 6. Практычнае заданне. Грамадска-палітычнае жыццё ў БССР у другой палове 1940-х – 1980-ыя гады.**

**Заданне склала:** Тарповіч С.Р. настаўнік-метадыст ГУО «Лядецкая сярэдняя школа» Столінскага раёна

***Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні:***

1. Абапіраючыся на адну з гістарычных крыніц назавіце важную падзею ў гісторыі Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі (БССР)?
2. Вызначце асаблівасці грамадска-палітычнага жыцця ў БССР у другой палове 1950-х – першай палове 1980-х гадоў? Зрабіце вывад.
3. Прывядзіце факты з гістарычнай крыніцы, якія могуць быць сведчаннем таго, што Пётр Міронавіч Машэраў знаходзіўся ў апазіцыі да кіраўніцтва СССР? Канкрэтызуйце адказ прыкладамі з крыніцы.
4. Выкарыстоўваючы інфармацыю гістарычных крыніц абгрунтуйце ўласны пункт гледжання на змены, якія адбыліся ў грамадска-палітычным жыцці рэспублікі ў другой палове 1980-х гадоў?

**Крыніца 1. Дзяржаўныя сімвалы БССР**



Фрагмент тэксту Дзяржаўнага гімна  БССР

Мы, беларусы, з братняю Руссю
Разам шукалі к шчасцю дарог.
У бітвах за волю, у бітвах за долю
З ёй здабылі мы сцяг перамог!

Нас аб’яднала Леніна імя,
Партыя к шчасцю вядзе нас у паход.
Партыі слава! Слава Радзіме!
Слава табе, беларускі народ!

**Крыніца 2.**
**Параўнальная табліца. “Асноўныя рысы грамадска-палітычнага жыцця ў БССР**

| **Прыметы для параўнання** | Другая палова 1960-х – першая палова 1980-х гадоў | Другая палова 1980-х гадоў |
|---|---|---|
| **Становішча палітычных партый** | Адзіная палітычная партыя – камуністычная. Камуністычная партыя Беларусі (КПБ) у адпаведнасці з артыкулам 6 Канстытуцыі БССР (1978 г.) – кіруючая і накіроўваючая сіла ў грамадстве; існаванне аднапартыйнай палітычнай сістэмы. | Фарміраванне іншых палітычных арганізацый, партый і рухаў; зараджэнне і фарміраванне шматпартыйнасці (шматпартыйная палітычная сістэма). Адмена ў 1990 годзе артыкула 6 Канстытуцыі СССР (знікненне манаполіі КПСС на ўладу). |
| **Выбары ў Саветы народных дэпутатаў** | Саветы дэпутатаў поўнасцю знаходзіліся пад кантролем партыі і рэальнай улады не мелі. Кандыдатуры дэпутатаў загаддзя ўзгадняліся з партыйным кіраўніцтвам, выбары адбываліся на безальтэрнатыўнай аснове. | На месцы ў Вярхоўны Савет і мясцовыя Саветы народных дэпутатаў прэтэндавалі некалькі кандыдатаў, рашэнне было за выбаршчыкамі, выбары адбываліся на альтэрнатыўнай аснове. Узнікненне парламенцкай апазіцыі. |

**Крыніца 3.**
**Урывак з дакументальнай аповесці Славаміра Антановіча “Пётр Машэраў”.**

“…Асаблівая рыса характару П. М. Машэрава – прыстойнасць. Яму можна было давяраць таямніцы, не баючыся, што гэтая размова абернецца непрыемнасцю.

…Машэраў не належыў да тых людзей, якія пасля кожнага ўказання з Масквы адразу ж прыкладвалі руку да казырка: будзе зроблена. У яго заўсёды быў свой погляд, свае адносіны па тым ці іншым пытанні, ён імкнуйся выкласці сваю пазіцыю, якая часам і не супадала з лініяй ЦК КПСС…

… таленавіты чалавек, які імкнуўся быць асобай, чалавек нестандартнага мыслення”.

**Адказы:**

1. БССР – адна з дзяржаў-заснавальніц ААН.

Источник: adu.by Национальный институт развития образования

Уклад беларускага народа ў перамогу над нямецка-фашысцкай Германіяй, быў адзначаны выхадам БССР на міжнародную арэну ў якасці адной з дзяржаў-заснавальніц ААН. У сувязі з гэтым у 1951 годзе адбылося зацвярджэнне новага Дзяржаўнага сцяга БССР, а ў 1955 годзе – Дзяржаўнага гімна БССР.

2. Асаблівасці грамадска-палітычнага жыцця звязаны з кіруючай роляй КПСС (КПБ у нашай рэспубліцы), якая вяла народ да шчасця, з іменем Леніна. Аб гэтым сведчаць словы з тэксту Дзяржаўнага гімна БССР (крыніца 1):

Нас аб’яднала Леніна імя,
Партыя к шчасцю вядзе нас у паход.

Кантроль над Саветамі дэпутатаў, існаванне аднапартыйнай палітычнай сістэмы, безальтэрнатыўныя выбары, падбор кадраў і ўзгадненне кандыдатур у дэпутаты з партыйнымі органамі (крыніца 3). Вывад: поўны кантроль КПБ над жыццём грамадства, адсутнасць дэмакратычных пераўтварэнняў.

3. Нягледзячы на тое, што Пётр Міронавіч Машэраў быў прадстаўніком эпохі “застою”, можна лічыць, што ён знаходзіўся у апазіцыі да саюзнага кіраўніцтва – гэта пацвярджаюць наступныя факты: меў свой погляд, пазіцыю і меркаванні, якія ішлі ў разрэз з лініяй ЦК КПСС, не адразу выконваў загады зверху (не прыкладваў руку да казырка: будзе зроблена). У той перыяд – гэта быў сапраўдны подзвіг, што сведчыць аб П.М.Машэраве як чалавеку з цвёрдай грамадзянскай пазіцыяй, за плячыма якога знаходзіўся беларускі народ.

4. Абапіраючыся на гістарычныя крыніцы і свае веды вучні змогуць абгрунтаваць уласны пункт гледжання на змены, якія адбыліся ў грамадска-палітычным жыцці рэспублікі ў другой палове 1980-х гадоў. Звернуць увагу на знікненне манаполіі Камуністычнай партыі на ўладу, з’яўленне шматпартыйнасці. Змогуць выказаць уласную думку аб рэалізацыі дэмакратычных свабод, павышэнні ролі народа ў вырашэнні дзяржаўных спраў у Беларусі.